У параўнанні са сваім папярэднікам, асобай на Беларусі залётнай і абсалютна чужой, калі не больш, усяму нацыянальнаму, беларускаму, цяперашні старшыня выглядае вельмі прыстойна, хаця і інертна ў дачыненні да атрыманай ад папярэдніка спадчыны, не жадаючы выпростваць скрыўленае і перакручанае, аднаўляць знішчанае. Менавіта тады, за вельмі, дарэчы, кароткі, проста рэкордны час, карэнным чынам памянялася маральная атмасфера, прынамсі агульнае стаўленне ў Дзяржкамвыдзе да ўсяго беларускага. А гэта не можа не сведчыць пра нашу адмыслова нацыянальную духоўную кволасць і бесхрыбетнасць, нашу інертнасць і не памяркоўнасць славутую, а душэўную разлезласць і апустошанасць. Што паробіш, калі такі не нацыянальны, а антынацыянальны характар выхавалі стагоддзі паднявольнага рабскага існавання без сваёй дзяржавы і без сваёй выразнай нацыянальнай ідэі?! Што датычыць чынавенства, то гады камуністычнага панавання прывучылі людзей на дзяржаўнай службе бяздумна і бязвольна падпарадкоўвацца волі тых, хто стаяў на службовых прыступках вышэй і ад каго цалкам залежыў лёс падначаленага, гэта значыць кавалак так патрэбнага на пражыццё хлеба...

Гэта больш чым відавочна пацвердзілася той імгненнай "зменай вех", што адбылася ў сістэме Дзяржкамдруку пасля прыходу туды на пасаду старшыні У.Замяталіна. Перад гэтым у нашым дэпартаменце друку панавала нармальная для кожнай нармальнай дзяржавы і кожнага нармальнага грамадства атмасфера: справаводства вялося на нацыянальнай мове, і амаль усе супрацоўнікі і з наведвальнікамі, і паміж сабой размаўлялі на мове зямлі, дзе яны жывуць і працуюць незалежна ад сваёй нацыянальнай прыналежнасці.

Аднак варта было новапрызначанаму старшыні грэбліва адшпурнуць, як штосьці агіднае, напісаны па-беларуску дакумент, як тут жа ва ўсіх выдавецтвах, а ў рэдакцыях газет, мяркую, таксама, дырэктары і галоўныя рэдактары, што называецца, сталі на вушы і аддалі вусныя распараджэнні ўсё справаводства перавесці на рускую мову. Асаблівы імпэт, за што быў адразу ж заўважаны і абласканы, праявіў ён, Георгій Марчук, дырэктар дасюль самага беларускага з усіх выдавецтваў. Каб сказанае загучала больш пераканаўча, дазволю сабе падаць крыху гісторыі.

"Мастацкая літаратура" была заснавана ў 1972 годзе, у час, калі амаль поўны заняпад беларускай мовы выклікаў трывогу інтэлігенцыі, і, трэба сказаць, грамадскае ўзрушэнне было належна ўспрынята ў вярхах як сігнал, своеасаблівы SOS, што апускацца і падаць ужо няма куды, бо іначай надыдзе незваротная духоўная катастрофа. Вось тады і было прынята рашэнне вярнуць на Беларусь кнігу на роднай мове. Практычную арганізацыю справы даручылі людзям адказным і вопытным — эканамісту па адукацыі, пісьменніку Міколу Ткачову і празаіку Анатолю Кудраўцу, які ўжо меў вопыт адміністрацыйнага кіравання, некалькі гадоў працы ў ЦК КПБ. Кіраўнікам новай установы дазволілі падабраць і сфарміраваць штат аднадумцаў, што і было зроблена хутка і кваліфікавана. І намаганні дружнага, зладжанага ў працы калектыва далі адразу ж адчувальны плён. Выдадзенае "Мастацкай літаратурай" пералічыць тут проста немагчыма, бо гэта зойме шмат старонак тэксту. Таму назаву толькі серыі, па назвах якіх чытач здолее ўявіць, наколькі абсяжна і смела разгортвалася ў той час на радзіме Скарыны кнігавыданне. Вось яны, тыя серыі: "Першая кніга паэта", "Першая кніга празаіка", "Бібліятэка замежнай прозы", "Кніга перакладчыка", "Скарбы сусветнай літаратуры", "Спадчына", "Бібліятэка беларускай класікі", "Літаратурныя помнікі Беларусі", "Галасы беларускага замежжа"...

Кажучы агулам, ставілася зусім рэальная задача родным словам асвойтаць увесь абсяг мастацкай літаратуры як ушыркі (створанае чалавецтвам на працягу тысячагадовай гісторыі развіцця), так і ў глыбіню ўласнага мастацкага самапазнання, пачынаючы ад вытокаў нацыянальнага пісьменства і заканчваючы яго перспектывай на будучыню, гэта значыць падтрымкай таго, што толькі нараджаецца.

Але дзе, узнікае заканамернае пытанне, гэтая да драбніц прадуманая нацыянальная, але пазбаўленая местачковага правінцыялізму, замкнёнасці толькі на сваім, праграма цяпер, куды падзеліся серыі, што мелі, безумоўна, попыт у чытача, куды зніклі-падзеліся альманахі-штогадовікі "Братэрства" (літаратура далёкага замежжа) і "Даляглады" (літаратура блізкага замежжа)?..

Чуецца адказ па-філасофску, ды па-беларуску спакойны, памяркоўны і разважлівы, але нейкі, як на здаровую галаву, не вельмі ўцямны: ведаеце, яно сапраўды ўсё нібыта было, але потым, ведаеце, узяло ды некуды падзелася... Карацей, быццам Рабунька сваім шорсткім языком злізала... Ах, дык вы не ведаеце, хто такая Рабунька?! Тады, хай выбачаюць дасведчаныя, але для іншых мушу патлумачыць, што гэта мастацкі персанаж з выдатнай гумарыстычнай (і сатырычнай таксама) аповесці Алеся Наварыча "Прыгоды Рабунькі", якая выразна і адмыслова вылучаецца на агульным тле нашай увогуле паснаватай і не надта багатай на сапраўдныя адкрыцці, на смелыя эстэтычныя знаходкі сучаснай літаратуры. А Рабунька вобраз цікавы, ён уяўляе сабой своеасаблівы гібрыд чалавека-быдла, цалкам пазбаўленага маральных нормаў, традыцыйнай нацыянальнай духоўнасці, але з маладых гадоў да самазабыцця апантанай ідэяй высокай улады. Дзякуючы сваёй настырнасці, а яшчэ больш даверлівасці і наіву тутэйшага электарату, што свята паверыў шчодрым абяцанням, Рабунька досыць лёгка дасягае запаветнай мэты і, сапраўды, нібы языком злізвае ўсё, што стваралася народам на працягу тысячагадовага развіцця: культуру, мову, саму гістарычную памяць... Хто не чытаў, абавязкова раю прачытаць гэты, надрукаваны ў часопісе "Крыніца", твор. Не толькі ад душы пасмеяцеся, але і на многія рэчы пагледзіце інакш, больш пранікнёным і даверлівым поглядам.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля
15 ЛІПЕНЯ 1999 г.

Узлёт ці падзенне,

або Кім было і стала цяпер выдавецтва "Мастацкая літаратура"

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Але вернемся да канкрэтных спраў "Мастацкай літаратуры". Выдавецтву працяглы час вельмі шанцавала на начальства. На змену Ткачову і Кудраўцу прыйшлі таксама выдатныя людзі і спецыялісты — Міхал Дубянецкі, Вера Палтаран, Варлен Бечык, Павел Місько, Аркадзь Марціновіч, Серафім Андраюк... Многіх з іх (Ткачова, Дубянецкага, Бечыка, Палтаран) ужо няма сярод нас, хай будзе ім родная зямля пухам. Але душам іхнім, напэўна, няма на тым свеце супакаення, бо адтуль, з вечнасці глядзяць гэтыя выдатныя людзі сваімі разумнымі вачыма са здзіўленнем і паняверкай на нас, і ў іх позірках бачыцца несуцешная пакута за іх дзецішча, іх выдавецтва, якое па ўсіх паказчыках апынулася цяпер на краю бездані. Людзей, якіх яны дбайна збіралі і гадавалі як прафесіяналаў выдавецкай справы, цяперашні дырэктар, порстка ўзяўшы "пад казырок", запэўніў, ад хвалявання блытаючы ўсе, якія ведаў, мовы, у тым ліку і свой давыд-гарадоцкі дыялект: "Я вас прыўкрасна паняў, усэ будэ зьдзелана!" І ў тэмпе, аднаго за адным, пад фанфары, выправадзіў з выдавецтва, не зважаючы на іх званні, узнагароды і, само сабой, заслугі перад нацыянальнай культурай: Рыгора Барадуліна, Васіля Сёмуху, Уладзіміра Арлова, Серафіма Андраюка... На цалкам, заўважым, "законных" падставах: адных, хоць і былі ў добрай працоўнай форме і цягнулі, як валы, адправіў на пенсію, а іншых пазвальняў па скарачэнні, зрабіўшы дзеля гэтага пару бюракратычных маніпуляцый: "памечаных" супрацоўнікаў звёў у адну рэдакцыю, а потым яе зліквідаваў сваім загадам на падставе неабходнасці скарачэння штатаў... А сябе зрабіў самаўпраўным маленькім царком: у адной асобе атрымаўся таксама своеасаблівы гібрыд дырэктара з галоўным рэдактарам. Мае, праўда, пад рукою двух загадчыкаў аддзелаў: адзін загадвае сучаснай беларускай літаратурай, другі — усім, што выдаецца, іншым. Першы з іх чалавек сімпатычны, асабліва для асобаў жаночага паходжання; літаратар таксама цікавы і своеасаблівы, але, як грамадзянін, без моцнага стрыжня, з гэткім лагодна-скептычным стаўленнем да ўсяго, з гулліва-эстраднай усмешачкай на вуснах: ён, маўляў, усё разумее і таму адносіцца да такой брыдоты са скепсісам і пагардай. Як у той казцы: і я не я, і хата не мая... Ну а другі, наадварот, удае сабой вельмі грунтоўнага і самавітага чалавека — як "начапіў" яшчэ ў камуністычныя часы на сваё аблічча выраз правадыра сусветнага пралетарыяту, так і ходзіць з ім дасюль, задаволена цярэбячы ленінскую бародку.

Справа, зрэшты, не ў чыста чалавечых, індывідуальных асаблівасцях: на тое мы і людзі, каб кожнаму быць самім сабой, а ў адказнасці і перад сабой, і перад часам — папярэднікамі і нашчадкамі за ўсё тое, што з такімі намаганнямі стваралася, а мы з такой лёгкасцю знішчылі ці дазнішчаем...

Узнікае пытанне: няўжо ўсяго гэтага не бачыць, не заўважае шаноўны Міхаіл Васільевіч Падгайны, старшыня Дзяржкамдруку? Дык як жа не бачыць такога, яно ж як на далоні, навідавоку?! І справа не толькі ў адной "Мастацкай літаратуры". Мы так пафасна-дэкларатыўна гаворым пра роўнасць беларускай і рускай мовы на Беларусі. А як на справе? А на справе, у жыцці ідзе планавае і мэтаскіраванае задушэнне беларускай. Бо што казаць пра іншыя, не гуманітарныя сферы, калі і там, дзе яна па ідэі павінна пульсаваць магутным струменем, яе ўжытак усё больш звужаецца, як тая шагрэневая скура. Справаводства ж па-беларуску, як было скасавана, адменена пры папярэдніку, так і не аднаўлена пры сучасным старшыні.

Дык чаму б Вам, шаноўны Міхаіл Васільевіч, не сказаць сваім падначаленым, кіраўнікам асобных установаў і арганізацый: ды не бойцеся, мае мілыя, мае харошыя, ды пазбаўцеся нарэшце гэтага рабскага страху, сваёй спрадвечнай прыніжанасці, будзьце мужчынамі, не саромейцеся і не бойцеся размаўляць са мной і весці дакументацыю па-беларуску. Хіба Вам неўпрыклад: у "Юнацтва" прыйшоў на працу новы, не апуджаны страхам дырэктар, Алесь Камароўскі — хіба я караю, ці нават ушчуваю за яго беларускасць?!

Маўчыце, і мабыць, пакуль што так не скажаце, бо пытанні-папрокі гэтыя бумерангам адскочаць ад іх да Вас. Бо ці не падобным чынам і самі паводзіце: перад удзельнікамі VI з'езда ТБМ паказалі выдатнае веданне беларускай мовы, але пасля некалькі разоў выступалі па радыё (прынамсі, што чуў я) і хоць бы разочак злітасціваліся, кажучы па-руску, *снизошли* да роднай мовы, хоць бы адно слоўца па-беларуску прамовілі! Саромеецеся ці асцерагаецеся непрыемнасцяў ад вышэйшага начальства, таго самага-самага, што стаіць і над Вамі, і над усімі намі?! Так, як і Вы, усё беларускае чынавенства стараецца патрапіць са сваім начальствам у такт, каб, барані Божа, за непаслухмянасць ці недагодлівасць не пазбавіцца свайго службовага крэсла! А ў выніку атрымліваецца ўсеагульнае прытворства-дагаджанне, а ў выніку ўсё вузее і вузее арэал выкарыстання беларускай мовы. І як тут не згадаць мудрыя сваёй знешняй прастора, але ў нашай сітуацыі глыбокія па сутнасці словы Якуба Коласа: "Калі самыя высокія чыноўнікі загавораць па-беларуску, то і народ будзе гаварыць на сваёй мове".

Ад сябе дадам: і кніжкі на беларускай мове выдаваць, і чытаць іх, і справаводства весці па-беларуску таксама!

Яўген ЛЕЦКА,
сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, кандыдат філалагічных навук.

Выставы

Мелодыі Бацькаўшчыны

Сёння ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрываецца выстава "Мелодыі Бацькаўшчыны...", прысвечаная 180-годдзю з дня нараджэння сусветна вядомага кампазітара, нашага славутага земляка — Станіслава Манюшкі.

Наведвальнікі выставы змогуць пабываць у музычным салоне XIX стагоддзя, адчуць атмасферу, у якой тварыў кампазітар. Тут можна будзе пабачыць палотны сучасных мастакоў, музычныя інструменты, клавіры, цікавыя музейныя экспанаты.

20,22, 27 ліпеня ў рамках дадзенага мерапрыемства пройдуць канцэрты Мінскага абласнога камернага хору "Санорус".

У стварэнні юбілейнай выставы прынялі ўдзел Міністэрства культуры РБ, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў РБ, Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай музычнай культуры РБ, Нацыянальны мастацкі музей РБ, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Музей сучаснага мастацтва РБ.

Даведкі па тэл. **227-43-22.**

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Дапамога з Германіі

Урад і Таварыства Чырвонага Крыжа Германіі адгукнуліся на зварот Беларускага Чырвонага Крыжа аб прадастаўленні грашовай дапамогі ў суме 39 300 марак ФРГ грамадзянам Беларусі, якія пацярпелі ад сёлетняй веснавой паводкі.

Як паведамілі ў Пасольстве Германіі ў Беларусі, грошы накіраваны ў Столінскі, Лунінецкі і Пінскі раёны Брэсцкай вобласці, а таксама ў Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці. У сакавіку ў гэтых раёнах ад паводкі пацярпела каля 5 тысяч дамоў тамтэйшых жыхароў. Зараз, праз 3 месяцы пасля паводкі, дамы пацярпелых усё яшчэ маюць патрэбу ў тэрміновым рамонце.


Што ж тычыцца кампенсацыі з боку мясцовых улад, то, паводле слоў жыхароў адной з вёсак Жыткавіцкага раёна, яе памер склаў 2 млн. рублёў на сям'ю, прычым страты ацэньваюцца ў сярэднім на суму не менш чым 50 млн. рублёў на сям'ю. Пры гэтым варта ўлічваць, што зарплата вясковых жыхароў складае каля 3 млн. рублёў і не выплачваецца многія месяцы.

Наталля КУЛАГІНА.

ШАШКИ

Посвящается юбиляру

Кандидат в мастера спорта пинчанин Александр Коготько предлагает любителям шашек две интересные и поучительные, составленные им практические дамочные окончания.



I. Белые: дамки a5, b2 (2).
Черные: простые c5, e5, e7, f6, g5, g7 (6).
II. Белые: дамка h6, простая a7 (2).
Черные: простые b4, c5, d6, f6 (4).

Если перефразировать известные классические слова, то об этих позициях можно сказать следующее: "Сильнее дамки зверя нет". А значит, белые при своем ходе должны выиграть над превосходящими силами соперника.

Свои решения присылайте по адресу: **220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шашки".**

Однако коль начался разговор об юбиляре, то автор посвящает эти позиции своему земляку Н.И.Андрющенкову, которому 12 июля 1999 года исполнится 70 лет.

Надеюсь, что и все любители шашек, и лично ведущий этой рубрики присоединятся к этому поздравлению.

Николай Иванович Андрющенков является первым мастером спорта по шашкам в Брестской области (1981), много лет работал в школе детей-инвалидов по слуху. На сегодняшний день является судьей национальной категории по шашкам (1972), по линии спортивного общества "Спартак" награжден значком "Тренер-общественник ДСО "Спартак" (1974) и, конечно, такой человек стал "Ветераном физкультуры и спорта БССР", значок и удостоверение которого ему вручили в 1983 году.

Но кроме всего перечисленного Николай Иванович еще и практический составитель, из-под "пера" которого выходят прекрасные окончания. Одно из них предлагает внимательно разобрать любителям шашек.

Белые: дамки a7, h6 (2).
Черные: простые b4, b6, c5, e7, h4 (5).

Это окончание юбиляра приведем вместе с решением, что своего рода будет являться ключиком к разгадке двух предыдущих подобных позиций, предложенных для решения.

1.h6-d2! b6-a5 (1. ...b4-a3 2.d2-a5x) 2.a7:d4 e7-d6 (2. ...h4-g3 3.d4-b6x) 3.d2-e1 b4-a3 (3. ...d6-c5 4.d4:b6x) 4.d4-h4 a5-b4 5.e1:a5 h4-g3 6.a5-b6, и белые дамки выигрывают против трех простых черных.

Нам пишут

Хотимск (Могилевская область). Здесь состоялся республиканский шашечный турнир-64, посвященный 55-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков.

24 спортсмена (9 мастеров спорта и 15 кандидатов) оспаривали звание победителя и последующие призовые места по швейцарской системе в девять туров.

В итоге победителем стал мастер спорта из Бобруйска Николай Кодесников — 13 очков из 18 возможных. Отстав от него на одно очко, последующие места соответственно заняли мастера спорта Владимир Чернышевич, Валерий Марковский (оба из Бобруйска) и минчанин Вячеслав Полянский.

Четверо кандидатов в мастера — могилевчанин Александр Никанов, Александр Климов из Кличева и хотимчане Виктор Дабыдовский, Сергей Артеменко — выполнили нормативы мастеров спорта. Поздравляем их с этим успехом!

Появилась на шашечной географической карте Беларуси новая точка — Хотимск. Хочется пожелать хотимчанам дальнейших успехов и популярности среди сильнейших шашистов республики.

Борис АГАШИН, мастер спорта.

ШАХМАТЫ

Задача писателя

В.Набоков

Белые: Крh1, Лg3, Лg7, Се5, пп. е4, h2 (6).
Черные: Крg5, пп. g4, g6, h5 (4).
Мат в 3 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахмат трехходовую задачу, автором которой является выдающийся русский писатель-эмигрант Владимир Набоков. С шахматами Набоков познакомился в детстве. А в возрасте 18 лет в 1917 году увлекся шахматной композицией. В качестве автора он дебютировал в 1920 году, когда в берлинской эмигрантской газете "Руль" была опубликована первая его композиция. По собственному признанию Набокова, в продолжении 20 лет эмигрантской жизни в Европе он посвящал чудовищное время составлению шахматных задач. В 20-е годы он вел шахматный отдел "Руля" и порой печатал там свои задачи без указания авторства. В книге "Другие берега", написанной уже в США в 1953—1954 годах он так высказался о своем отношении к шахматной композиции: "Меня лично пленяли в задачах миражи и обманы, доведенные до дьявольской тонкости, и хотя в вопросах конструкции я старался по мере возможности держаться классических правил, как, например, единство, чеканность, экономия сил, я всегда был готов пожертвовать чистотой рассудочной формы требованиям фантастического содержания".

Задача, которая показана на диаграмме, была опубликована в журнале "The Problemist" в 1969 году. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Возраст — не помеха!

В Минске в Национальном центре шахмат и шашек прошел 7-й открытый чемпионат Республики Беларусь на призы шахматной ассоциации инвалидов и ветеранов "Шанс". В турнире, проводившемся по круговой системе, приняли участие 12 спортсменов, в том числе 8 кандидатов в мастера. Соревнования прошли в острой бескомпромиссной борьбе, исход которой определился лишь в заключительном туре. В итоге лучший результат — 9 очков из 11 возможных — показал кандидат в мастера из Орши Александр Горбылев, завоевавший первый приз. На очко от победителя отстал ветеран войны кандидат в мастера Виктор Михайлович Нахаенко (Бобруйск). Большого успеха добился старейший участник турнира 75-летний перворазрядник инвалид войны Борис Петрович Полыгалов (Витебск). Набрав 7,5 очка, он завоевал бронзовую медаль. Кроме того, Б.Полыгалов выполнил норму для присвоения разряда кандидата в мастера. Кандидатскую норму выполнил также перворазрядник из Гродно Андрей Святохо.

Из шахматной истории

В 1964 году в Тель-Авиве проводилась XVI Всемирная шахматная Олимпиада. На заключительном банкете присутствовали члены израильского правительства во главе с первым премьер-министром Израиля Давидом Бен-Гурионом. В один из моментов банкета Бен-Гурион пригласил к своему столу советских шахматистов, выигравших золотые медали Олимпиады. В завязавшейся беседе, а Бен-Гурион свободно говорил на русском языке, он между прочим заметил, что Израиль заинтересован в притоке советских евреев, поскольку люди они энергичные, образованные, не избалованные жизнью и могут принести своей исторической родине большую пользу.

Выслушав все сказанное Бен-Гурионом, многократный чемпион мира Михаил Ботвинник внимательно посмотрел на собеседника сквозь толстые линзы очков и холодно произнес: "А вы не боитесь, что они сделают у вас революцию?"

Экалогія

Дзе ў Мінску лепей жыць?

Асноўнай крыніцай забруджвання паветра ў Мінску з'яўляецца аўтатранспарт. Аб гэтым паведаміў галоўны санітарны ўрач сталіцы Віктар Чалноў. На долю аўтатранспартных сродкаў прыходзіцца 70 працэнтаў шкодных выкідаў у атмасферу.

Паводле слоў В.Чалнова, падобная сітуацыя з'яўляецца вынікам эксплуатацыі мінчанамі патрыманага "таннага" аўтатранспарту. Пры гэтым, па статыстыцы, на адну тысячу жыхароў сталіцы прыпадае 150 аўтамабіляў. Разам з тым у сувязі са скарачэннем працы прамысловых прапрыемстваў значна скарацілася колькасць шкодных выкідаў у атмасферу ад прамысловых крыніц. Калі ў былыя савецкія часы выкіды ад прамысловых прадпрыемстваў складалі да 100 тысяч тон у год, то зараз — каля 43 тысяч тон.

Найбольш дрэнны ў экалагічным плане раён горада — Кастрычніцкі, на тэрыторыі якога, як вядома, размешчаны чыгуначны вакзал. Крыху лепшая экалагічная сітуацыя ў традыцыйна "брудным" Заводскім раёне, дзе размешчаны буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы горада.

Самым жа чыстым галоўны санітарны ўрач назваў Першамайскі раён сталіцы.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Спорт

Сенсация в Ферраре

Белорусские каратисты оказались вне конкуренции

Если в небольшом итальянском городке Феррара до сих пор както образом не слышали о стране под названием Беларусь, то после того, как в нем побывала белорусская дружина каратистов, таковые едва ли остались.

Здесь прошел 8-й международный турнир "Трофеи Тополино" (это итальянское имя знакомого нам Микки-Мауса) среди участников от 7 до 14 лет, выступавших в четырех возрастных группах. В каждой из них индивидуальные соревнования проводились отдельно для обладателей желтых, оранжевых, зеленых, синих, коричневых и черных поясов (в Беларуси черный пояс присваивается спортсменам только по достижении 16 лет, в некоторых странах существуют так называемые "детские даны"). В командных же соревнованиях учитывался только возраст.

Из-за большого числа участников — около 900 человек — соревнования проводились отдельно для итальянцев (хозяев этого спортивного мероприятия) и для иностранных спортсменов. Среди более 300 представителей 12 зарубежных стран белорусская делегация была одной из самых многочисленных. 37 белорусских ребят из минских клубов "Академия каратэ", "Ирбис-БГПА", "Фудосин" и поставского "Азимут" потрудились на славу: увезли домой 42 медали из 96 возможных. Благо, в городском Дворце спорта, где разыгрывались "Трофеи Тополино", организаторы умудрялись разместить аж 15 площадок для соревнований — татами, на которых демонстрировали свое мастерство соответственно по 15 участников одновременно. 150 судей работали в полную силу! Каждый спортсмен выступал поочередно на двух площадках перед разными бригадами судей, за счет чего существенно повышалась объективность оценки. Командные соревнования проводились по такому же принципу на 8 площадках. Победителями здесь стали: среди участников 9—10 лет — Константин Вишневский, Захар Савчиц и Антон Хвостович, среди 11—12-летних — Анна Антонова, Анна Суспицина и Наталья Рыбалко. (Кстати, все шестеро — победители первенства Европы прошлого года по своим возрастам). Кроме того, в командных соревнованиях белорусские спортсмены завоевали еще два вторых и одно третье места.


В индивидуальных выступлениях белорусские каратисты также блеснули высоким мастерством. Среди обладателей желтых поясов чемпионами в своих возрастных категориях стали: Михаил Иванов, Дмитрий Асташов, Алексей Лихач, Александр Муравьев. Выступление в категории оранжевых поясов принесло победу Захару Савчицу и Олегу Кучмасову. По зеленым поясам первое место у Константина Вишневского, Анны Антоновой, Гордея Снегирева. По синим — у Александра Буличева. В связи с тем что белорусская команда была многочисленной, некоторые участники соревновались в группе спортсменов более высокой квалификации. Особо можно отметить новоиспеченных чемпионов: Наталью Рыбалко — обладательницу желтого пояса, выступавшую по уровню синего, и обладателя зеленого пояса Дмитрия Анискевича, выступавшего по коричневому поясу. Пример этих спортсменов красноречиво свидетельствует: наших каратистов готовят с большим "запасом прочности".

В общекомандном зачете Беларусь первенствовала с большим отрывом (42 медали), опередив "призеров" — Словению (18 медалей) и Швейцарию (11 медалей), а также сильные команды Польши, Испании, Германии, Румынии, Израиля, Кипра... К слову, успех юных белорусских каратистов был отмечен в местной прессе. Так, газета "Новая Феррара" не поскупилась на похвалу в адрес наших спортсменов, признав их выступления сенсационными.

Победа воспитанников — плод кропотливого труда их наставников. Представители клуба "Азимут" (руководитель Сергей Седых) привезли из Италии 2 серебряные медали, на счету "Фудосина" (тренер Сергей Снегирев) по две золотых и серебряных, а также бронзовая медали. Остальные 35 наград (16 золотых, 12 серебряных и 7 бронзовых медалей) пришлись на долю юных спортсменов из клубов "Академия каратэ" и "Ирбис-БГПА", возглавляемых нашими известными специалистами Светланой и Андреем Вилькиными.

Вячеслав КЛИМЕНКО.

Стоп-кадр



Этот кадр был сделан на недавнем международном турнире по таиландскому боксу и кикбоксингу, в котором приняли участие спортсмены из Беларуси, Франции, США, Голландии и Украины. Прошел турнир в спорткомплексе по ул.Притыцкого в Минске.

Фото IREX/ProMedia.

Здарэнне

У жыхара горада Скідаль канфіскавана сем кілаграмаў ртуці і 14 кантэйнераў з радыеактыўнымі рэчывамі

Праваахоўныя органы канфіскавалі ў жыхара горада Скідаль Гродзенскага раёна сем кілаграмаў ртуці і 14 кантэйнераў з радыеактыўнымі рэчывамі. Узбуджана крымінальная справа.

Гэта не першы выпадак, калі на Гродзеншчыне знаходзяць ртуць. У сакавіку гэтага года ў пасёлку Верцялішкі Гродзенскага раёна ў сценах двух кватэр была выяўлена вялікая колькасць ртуці. Яе ўтрыманне ў паветры перавышала норму ў чатыры разы. Ад пароў ртуці пацярпелі жыхары, якіх часова адсялілі.

Спецыялісты штаба грамадзянскай абароны выказваюць розныя меркаванні наконт з'яўлення небяспечных рэчываў. На іх думку, у часы СССР Гродзеншчына была шчыльна насычана ваеннымі базамі, пры ліквідацыі якіх раскрадалася ўсё, што трапляла пад руку, — у тым ліку шкодныя рэчывы.

Антон ЛАБОВІЧ.

Анекдот

Во банкиров развелось

В центре города на голову прохожего упал кирпич. Толпа возмущается:

— Куда власти смотрят, по улице невозможно пройти! И кто этот пострадавший?

— Мой сосед, банкир...

— Во — банкиров развелось, и кирпичу негде упасть, — послышалось из толпы.

Культура

Цана білетаў на выступленні расійскіх "зорак" у рамках фестывалю "Славянскі базар у Віцебску" дасягне 10 мільёнаў рублёў

У Віцебску распачаўся продаж білетаў на канцэрты Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Сёлета цэны фестывальных білетаў цалкам супастаўныя з коштам наведвання гастрольна-канцэртных мерапрыемстваў у сталічных канцэртных залах. Так, лепшыя месцы ў амфітэатры на выступленні расійскіх "зорак" Філіпа Кіркорава і Валерыя Лявонцьева, а таксама на цырымоніі адкрыцця і закрыцця фестывалю можна набыць па цане да 10 млн. рублёў. Сольныя канцэрты Сафіі Ратару і Ларысы Долінай абыдуцца іхнім прыхільнікам у 2—7 млн. рублёў, іншыя праграмы з удзелам "зорак" — ад 1 да 5 мільёнаў.

"Сацыяльныя цэны" — ад 300 000 беларускіх рублёў — устаноўлены толькі на канцэрты конкурсу маладых выканаўцаў, праграму расійскага фестывалю "Казачы круг", украінскую праграму і гала-канцэрт маладых удзельнікаў фестывалю. Сёлета выступаў "зорак" эстрады на вулічных пляцоўках не чакаецца; са сцэны, размешчанай на плошчы Свабоды, абяцалі выступіць толькі група "Балаган лімітэд", паэты Мікалай Дабранраваў і Аляксандр Шаганаў, шматлікія фальклорныя калектывы.

Марына КУНОЎСКАЯ.

Диагноз

Что у вас с сердцем

Из года в год растет число страдающих сердечными заболеваниями. Наш организм заблаговременно посылает тревожные сигналы, надо просто к ним прислушаться. Вот достаточно простой тест, благодаря которому, даже не обращаясь к врачу, вы узнаете, в каком состоянии у вас сердце и кровеносные сосуды.

1. Вы старше 55 лет — 1
   Вы младше 55 лет — 0
2. Ваш пол:
   мужской — 1
   женский — 0
3. Хотя бы один из ваших ближайших родственников перенес инфаркт или апоплексический удар.
   До 55 лет — 2
   После 55 лет — 1
   Нет — 0
4. У одного из ваших ближайших родственников был сахарный диабет.
   Нет — 0
   Да — 1
5. У одного из ближайших родственников были или есть проблемы с обменом веществ.
   Нет — 0
   Да — 1
6. Количество холестерина у вас в крови:
   более 6,5 ммоль/л — 2
   5,2–6,5 ммоль/л — 1
   5,2 ммоль/л или менее — 0
7. Ваше обычное давление:
   160/105 или выше — 2
   140/90 – 160/105 — 1
   не выше 140/90 — 0
8. Ваш вес:
   нормальный — 0
   немного избыточный — 1
   весьма избыточный — 2
9. Испытываете стрессы на работе и/или в личной жизни:
   нет — 0
   да — 1
10. За день выкуриваете:
   более 30 сигарет — 2
   менее 20 сигарет — 1
   не курю — 0
11. То же, что пункт 10, но для женщин, которые курят и пользуются контрацептивными средствами:
   30–40 лет — 1
   более 40 лет — 2

Подсчитайте, сколько очков вы набрали.

* * *

0–3 балла

Риск того, что вас подстерегает сердечно-сосудистое заболевание, весьма невелик. Риск заболеть в течение ближайших десяти лет – всего 5 процентов.

4–6 баллов

Риск сердечно-сосудистого заболевания – 10–20 процентов. Об этом не следует забывать. Сказываются такие факторы: возраст, пол, курение, давление, количество холестерина в крови. Особенно это относится к людям, рискующим болезнь унаследовать.

7–12 баллов

Риск сердечно-сосудистого заболевания – 20–40 процентов.

Более 12 баллов

Вы входите в группу повышенного риска. Постарайтесь, чтобы вес, давление и обмен веществ соответствовали норме.

Четверг, 15 июля

Белорусское телевидение

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 "Сегодня с вами..." Директор Высоковского высшего профессионального училища агропромышленного производства Юрий Сахарчук.
8.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.00 Новости.
9.10 Королевская охота.
9.40 Телевизионный Дом кино. VIII Международный кинофестиваль славянских и православных народов "Золотой Витязь" (г.Смоленск).
10.05 "Все мы родом из детства". IV Всебелорусский телефестиваль юных талантов. Минская область. 4-я часть.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.15 "Верность любви". Телесериал (Италия).
11.50 Четвертое измерение. Научно-популярная программа.
12.10 Наш край. "Альбом путешествий по Беларуси".
12.30 "А музыка звучит..." Фестиваль фольклорного искусства "Берегиня".
13.00 Новости.
13.15 Дневной сеанс. "Мегре колеблется". Худ. фильм. 1-я серия.
14.50 "Белорусская мачанка". Видеозарисовка.
15.00 Новости.
15.15 Сериал для детей. "Боишься ли ты темноты?" (Канада).
15.40 Мультфильм.
16.00 "Подземная дорога". Минскому метрополитену - 15 лет.
16.30 Гости в дом. К Национальному празднику Франции.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.10 "Пьедестал". Док.фильм о выдающихся белорусских спортсменах (ТО "Телефильм").
17.45 Усадьба. Программа для дачников.
18.15 "Верность любви". Телесериал (Италия).
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: "Разговор в прямом эфире", "Что делать?", юмористическая рубрика "Отбой".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.55 Телебарометр. Прогноз погоды.
22.15 П.Бомарше. "Безумный день, или Женитьба Фигаро". Спектакль Брестского театра драмы и музыки. 2-е действие.
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 Крок. Программа для молодежи.
24.00 Новости.
0.10 Акколада.
0.35 "Острова на далеких озерах". Короткометражный худ. фильм (ТО "Телефильм").

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 00.15 Новости.
08.15 "Во имя любви".
09.15 Джентльмен-шоу.
09.45 Мультсеанс. "Ежик в тумане".
09.55 Домашняя библиотека.
10.05 Сериал "Звездные воины".
14.15 Сериал "Гарри — снежный человек".
14.45 Возможно все!
15.00 Улица Сезам.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Сериал "Графиня де Монсоро".
18.15 "В поисках утраченного".
19.00 Детектив "Забытое убийство". Часть 2-я.
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Комедия "А был ли Каротин?" 1-я и 2-я серии.
23.25 Сериал "Темные небеса".
00.25 Программа передач.

Канал "Россия"

06.00 Доброе утро, Россия.
06.20 У всех на устах.
06.45 Телеигра "Программа передач".
08.15 Дежурная часть.
08.45 Товары — почтой.
09.10 Сериал "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.25 Сериал "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 "Жил-был Козявин". Мультфильм.
17.10 Гомеопатия и здоровье.
17.15 Худ. фильм "Сильва". 1-я серия.
18.25 Сериал "Да, господин министр".
19.40 Подробности.
19.55 "Два рояля".
20.45 Детектив "Король треф".
21.45 "Слушается дело".
22.45 Дежурная часть.
23.30 Юбилейный концерт радио "Деловая волна".
00.30 Магазин на диване.
00.45 Прогноз погоды.

Канал "Культура"

16.00 "Российский курьер".
16.40 "Совесть". Видеофильм.
17.30 Новости.
17.40 "Жили-были".
18.05 "Царская ложа".
18.45 "Человек в пейзаже, или Открытый космос В.Федорова".
19.15 Чудо-сказка.
19.30, 23.00 Новости культуры.
19.50 "Осенние портреты".
20.15 "Время музыки".
20.42 Анонсы.
20.45 После новостей...
21.05 "Час полнолуния". Худ. фильм.
22.35 Джазофрения.

НТВ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00 Сегодня утром.
06.10, 07.15 Спорт.
06.15, 07.20 Погода.
06.20 Градусник.
06.25, 07.45 Сегоднячко.
06.35 Мультфильм.
06.45 Карданный вал.
06.50 Впрок.
07.25 Криминал.
07.35 Большие деньги.
08.10 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.20 Худ. фильм "Гаджо".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Два капитана".
13.30 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 Сегоднячко.
15.30 Сериал "Нью-Йорк. Центральный парк".
16.25 Впрок.
16.50 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Боевик "Приказано взять живым"
20.35 Профессия — репортер.
21.45 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
22.40 Сегоднячко.
23.20 Сегодня в полночь.
23.50 "Антропология" Дмитрия Диброва.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.25, 20.25, 21.55 У стойки бара.
18.30 Мультфильм "Утка — черное крыло".
20.00 Новости "К-видео".
20.30 Вечарніца.
20.45 Сериал "Секретные материалы".
21.45 Отбой.
22.00 Комедия "Я и Малыш".

ТВ-6

05.55, 12.10 День за днем.
07.45, 17.20, 21.50 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00 ТСН-6.
08.10, 22.10 Те Кто.
08.25 "Вы — очевидец".
08.50, 09.50, 11.45, 14.20, 22.25 Телемагазин в Минске.
09.00, 17.55 Сериал "Династия II. Семья Колби".
10.10 Сериал "Найтмен".
10.55 Сериал "Зов убийцы".
14.10 "Знак качества".
14.40 Сериал "Просто Мария".
15.30 Мультсериал "Головокружительные приключения Билли и Теда".
15.55 Сериал "Готовы или нет".
16.25 ДИСК-канал.
17.30, 23.25 Сериал "Грейс в огне II".
19.00 "Новости дня".
19.30 "О.С.П-студия".
20.25 "В мире людей".
20.55 Сериал "Вавилон 5".
22.05 Шесть новостей дня.
23.00 Сериал "Дневники Красной туфельки".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №896